АТРЫМАЙ НАРАД НА УРАДЖАЙ ЗЯМЛІ АБНОЎЛЕНАЙ

Вясковаму комсамольцу ў дапамогу па рэалізацыі сталінскай пуцёўкі

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

10 лістапада 1931 г. № 265 (1529)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

„Адгэтуль лёзунг „Аўладаць тэхнікай“ для работнікаў соцыялістычнага земляробства будзе адзначаць ня толькі лёзунг аўладаньня трактарам і комбайнам, але і лёзунг аўладаньня агрономіяй на аснове ўжываньня трактара і комбайна“ (Якаўлеў)

У бой за ўраджай 1932 году

Наша краіна стала краінай самай буйнай сельскай гаспадаркі ў сьвеце. Большая палова бядняцка-сярадняцкіх гаспадарак стала на шлях колектыўнага жыцьця і працы. Але трэба цьвёрда памятаць, што ўцягненьнем сялянскіх мас у колгасы не канчаецца соцыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі. Мы павінны зараз організацыйна замацаваць соцыялістычныя гаспадаркі, дабіць кулака, які пераніёе сваю барацьбу супроць колгасаў непасрэдна ў соцыялістычную вытворчасьць, зрывае організацыю працы, разлагае дысцыпліну. Мы павінны спэцыялізаваць гаспадарку дабіцца высокай таварнасьці, заваяваць высокаўстойлівы ўраджай на соцыялістычных палёх, аўладаць агротэхнікай і зоовэттэхнікай. Аднак, гэтыя пытаньні не зьяўляюцца яшчэ стрыжнявымі ва ўсёй рабоце комсамольскіх організацый многіх саўгасаў і колгасаў.

Каб выканаць дырэктывы партыі аб організацыйным умацаваньні колгасаў і саўгасаў, комсамольскімі ячэйкамі неабходна:

Узьняць удзел усёй ячэйкі і кожнага комсамольца паасобку ў пляніраваньні саўгаснай і колгаснай вытворчасьці, у складаньні вытворчых і рабочых плянаў у колгасах, організацыі зьменай-сустрэчных плянаў у саўгасах, дабіцца правільнай організацыі працы расстаноўкі вытворчых сіл, укараніць зьдзельшчыну, улік колькасьці і якасьці працы колгасьнікаў, актыўна ўдзельнічаць у разьмеркаваньні ўраджаю, змагацца са скажэньнямі дырэктыў партыі і ўраду па гэтых пытаньнях, упарта змагацца за спэцыялізацыю гаспадаркі, за ўздым соцыялістычнага накапленьня ў колгасах. Праз організацыю брыгад вопытнікаў і рацыяналізатараў вывучаць якія з галін і культур с-гаспадаркі ва ўмовах колгасаў, саўгасаў зьяўляюцца вядучымі, высока таварнымі, шырока популярызаваць іх сярод колгасьнікаў і дабіцца найхутчэйшага іх укараненьня.

Дабіцца каб соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам былі ахоплены ўсе колгасьнікі і рабочыя саўгасаў, змагацца за брыгадную сыстэму працы. Актывізаваць удзел камсамольцаў і моладзі ў вытворчых нарадах колгасаў і саўгасаў, а такса на праводзіць вытворчыя нарады з комсамольцамі і моладзьдзю, якія працуюць у паасобных галінах сельскай гаспадаркі (сьвінары, паляводы і г. д.).

Аўладаць агрэтэхнікай і зоовэттэхнікай г. зн. аўладаць вагарамі высокай ураджайнасьці, узьняць продукцыйнасьць соцыялістычнай жывёлагадоўлі. Дзеля гэтага трэба вывучыць якасьць глебы, яе апрацоўку, глыбіню і час ворыва, вывучыць гатункі насеньня іх асаблівасьці, калі і што пасеяць на кожным вучастку зямлі, вывучыць сродкі лепшай апрацоўкі глебы, структуру глебы, правільны севазварот адпаведна з напрамкам гаспадаркі, вывучыць, якія пароды буйнай рагатай жывёлы і сьвіней зьяўляюцца высока продукцыйнымі іх асаблівасьці, правілы кармленьня і догляду. Для гэтага комсамольскія організацыі павінны разгарнуць шырокую работу, дамагацца, каб у кожным колгасе і саўгасе былі гурткі агротэхнікі і зоовэттэхнікі.

Адначасова з гэтым, трэба разгарнуць падрыхтоўку кадраў. Без добра падрыхтаваных кадраў нельга правільна організаваць працу на вытворчасьці, нельга пасьпяхова ажыцьцявіць організацыйна-гаспадарчае замацаваньне колгасаў, змагацца за высокую таварнасьць. Комсамольская ячэйка павінна дапамагчы ўдарнікам аўладаць агротэхнікай, прасоўваць на кіруючую гаспадарчую работу брыгадзірамі, загадчыкамі розных галін вытворчасьці тых таварышоў, якія спраўдзілі сябе на рабоце. Ахапіць іх навучаньнем праз організацыю гурткоў і завочныя формы навучаньня, праводзіць з імі нарады і конфэрэнцыі для абмену вопытам і агротэхнічнай консультацыі. Гурткі па аўладаньню агротэхнікай і ахопленыя завочным навучаньнем таварышы павінны ўстанавіць шчыльную, жывую сувязь з раённай сельска-гаспадарчай станцыяй моладзі і цэнтральнай станцыяй ЛКСМБ, каб мець сталую тэхнічную консультацыю.

Комсамольскія ячэйкі саўгасаў і колгасаў павінны зараз-жа выступіць у конкрэтны бой за высокі ўраджай 1932 г.

Што дзеля гэтага трэба зрабіць у васеньні пэрыод? На 100 проц. выпаўніць зяблівае ворыва кліну, які вызначан пад яравы пасеў 1932 г. Заворваць трэба на такую глыбіню, каб узьняць увесь пласт ворнае глебы, а там, дзе пласт тонкі,—праараць яго глебапаглыбляльнікам. Калі ж пласты ворнае зямлі вельмі рознастайны, дык пры ўзьмёце на зябліва трэба папярэдне запрасіць консультацыю агронома, які дасьць параду аб глыбіні ворыва.

Зімовы пэрыод комсамольскія ячэйкі павінны выкарыстаць для таго, каб аўладаць тэхнікай с.-гаспадарчых машын, адрамантаваць с.-гаспадарчы інвэнтар, збрую, падрыхтаваць цягавую сілу і фуражныя фонды.

Пачынаючы з сакавіка м-ца трэба па-ўдарнаму разгарнуць работу па апрабаваньню насеньня, адсортаваць яго, скласьці каляндарныя і рабочыя пляны вясеньняй сяўбы, праверыць гужавы транспорт, распрацаваць з агрономам дакладную каляндарную програму калі і на якім вучастку распачаць апрацоўку зябліва, вывазку гною, якія культуры, у які час і на якім вучастку сеяць.

К пачатку вясеньніх палявых работ рабочая цягавая сіла павінна быць дакладна расстаўлена, уведзена зьдзельшчына, ліквідавана абязьлічка, прымацаваны брыгады да паасобных вучасткаў на ўвесь час сяўбы, а да брыгад—поўная колькасьць машын і цягавай сілы.

Кожны комсамолец і ячэйка павінны цьвёрда памятаць, што толькі аўладаўшы агротэхнікай і выступіўшы з восені ў бой за ўраджай 1932 г. мы забясьпечым сапраўды высокі бальшавіцкі ўраджай.

Комсамальцы колгасу „Іскра“ выступілі ў паход. Пачын іскраўцаў мы абавязаны ператварыць у паход усяго ЛКСМБ.

Пасьледваць нашаму прыкладу

Да ўсіх комсамольскіх ячэек саўгасаў і колгасаў БССР

Гаспадарча-організацыйнае ўмацаваньне колгасаў, уздым ураджайнасьці, укараненьне агротэхнікі—вось цэнтральныя задачы ў сучасны пэрыод разьвіцьця колгаснага руху.

Наш колгас „Іскра“, які яднае 180 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, раскінуты на 2 тысяч га, у апошні час і ўзяў такі напрамак.

Вясеньняя, уборачная, асеньняя сяўба і зябліва праведзены на зьдзельшчыну, наладжан правільны ўлік працадзён, увесь прыбытак разьмяркоўваецца выключна па колькасьці і якасьці працы. Організоўваецца сьвінаводча-таварная фэрма на 300 сьвінаматак, фэрма ўжо на 75 проц. укомплектавана. Адвак, ня маючы патрэбнага вопыту і адпаведных кадраў, догляд за сьвіным пагалоўем у нас вельмі дрэнны. Мы яшчэ не аўладалі тэхнікай вытворчасьці буйнай гаспадаркі. Гаспадарыць-жа па старому на новай зямлі не значыць ісьці наперад Тав. Якаўлеў кажа: „Усьлед за вырашэньнем проблемы буйнай дзяржаўнай і колектыўнай гаспадаркі трэба па-бальшавіцку ўзяцца за вырашэньне задачы: атрымаць высокі ўраджай на аснове ўжываньня ўсіх заваёў агрономічнай навукі“.

Выходзячы з задач сучаснага пэрыоду соцрэконструкцыі сельскай гаспадаркі, мы, комсамольцы колгасу „Іскра“, зараз-жа выступаем у бой за ўраджай 1932 году, за агротэхніку, за агромаксімум.

Абавязваемся ажыцьцявіць наступныя мерапрыемствы:

Перавесьці колгасныя палі на правільны севазварот, дзеля чаго зараз-жа сумесна з праўленьнем колгасу наметціць вучасткі поля для будучага севазвароту.

Прызнаючы, што зябліва— снова ўздыму ўраджайнасьці, пакласьці ўсе сілы на тое, каб поўнасьцю выканаць плян зяблівага ворыва на належную глыбіню, перакінуўшы ўсю цягавую сілу на гэту работу.

Палепшыць 10 га лугоў (асеньняя пераворка, баранаваньне, выкарчоўваньне. Наладзіўшы масавыя суботнікі выкарчаваць сіламі комсамольскай ячэйкі 3 гэктары хмызьняку. Зрабіць адну компостную яму. Каб павялічыць колькасьць угнаеньня, нарыхтаваць для падсьцілкі ў хлявы 100 вазоў гальля, лісьця і торпу.

Агледзець сьвінарнік і кароўнікі на зіму (уцяпліць, асьвятліць, пабудаваць кармушкі). Абвяшчаем комсамольскі штурмавы 3-х дзёньнік падрыхтоўкі жывёлы на зіму.

Мэханізаваць кухню сьвінарнікакаў, правеўшы рацыяналіватарскія мерапрыемствы: установку бульба-мешалкі, корнярэзкі, запарнікаў. Правесьці нумарацыю і якасны вучот сьвіней, распрацаваць пляны злучнай кампаніі.

Організаваць гурток па аўладаньню зоотэхнікай агротэхнікай. Праводзіць 2 разы ў тыдзень заняткі па політвучобе і агрозоотэхніцы, ахапіць усіх комсамольцаў вучобай. Організаваць пры ячэйцы бібліотэку па сельскай гаспадарцы, выпісаць часопіс „Ударнік палёў“ і іншыя агрономічна-навуковыя часопісы. Наладжваць сыстэматычна галосныя чыткі часопісаў і газэт па агрономічных пытаньнях.

Ажывіць работу вытворчай нарады, праводзячы нарады кожны месяц. Стварыць бюро рацыяналізацыі і даручыць яму збор прапаноў сярод колгасьнікаў.

За зімні пэрыод ачысьціць і пратруціць насеньне, увёўшы сэлекцыйныя гатункі, сачыць за правільным захаваньнем насеньня і праверыць усходжасьць яго.

Вывесьці да зімы гной пад агароды коранеплоды.

Увесьці на сьвінарніках, кароўніках і зяблівым ворыве прэміяльна-прогрэсыўную зьдзельную аплату.

Каб пасьпяхова выканаць гэтыя абавязкі і ўзьняць практычны ўдзел у колгаснай вытворчасьці, перабудоўваем працу ячэйкі, стварыўшы наступныя сэктары: жывёлагадоўчы, політвучобы, паляводзтва, культбытавы і друку.

Агульны сход комсамольскай ячэйкі зварочваецца да ўсіх комсамольскіх ячэек колгасаў і саўгасаў БССР з заклікам уключыцца ў паход за аўладаньне максімумам агротэхнікі за ўздым ураджайнасьці. Мы прапануем у студзені-лютым правесьці ўсебеларускую перадачу вопыту па аўладаньню агрозоотэхнікай.

Мы зварочваемся да ўсіх спэцыялістых сельскай гаспадаркі і жывёлагадоўлі з просьбаю дапамагчы комсамолу сваімі ведамі.

„Давайце возьмемся за наладжваньне вытворчага процэсу ў саўгасах і колгасах, рушым на барацьбу за ўраджай, за аўладаньне агротэхнікай з тэй самай рашучасьцю, рэвалюцыйнай сьмеласьцю, з тэй самай энэргіяй, з якой партыя вяла барацьбу за стварэньне колгасаў і саўгасаў, за пашырэньне пасеўных плошчаў“. (Якаўлеў).

Агульна-комсамольскі сход ячэйкі КСМ колгасу „Іскра“ Беларуцкага сельсавету Лагойскага раёну.

Зьмітро Віталін.

Мы зьмяняем твар зямлі

Адчынеце хаціну стагодзьдзяў,
Зазірніце пад нізкую столь—
Там, хістаючыся, праходзяць
Продкі нашыя—цемра і боль...

Гэту вось чорназёмную замець,
Руні жытняе сьвежы шоўк
Спавівалі калісьці платамі,
Супынялі й душылі мяжой.
І сьціскался грудзі болем.
Грудзі зморанае зямлі.

Апранала ў няўрод трахпольле
Разьмяжованыя палі...
А ў хаціне гарэла лучына.
І х ст...ся цені,
І йшлі
Людзі з стомленымі вачыма
Па сузмрочных шляхох зямлі...
Але...

Льлецца лёну шыр,
У прыбоі мора жыта...
Хутка прозелень мяжы
Будзе ў пераджытым!..
Перад намі—новы шлях
(А запал—ня згасьне!),
Па-над намі ўзьвіўся сьцяг,
Сьцяг зямлі колгаснай!..
Яшчэ смокчуць кроў зямлі,
Жостка раняць ногі
Бур'яны ды кавылі
Ля старой дарогі...

Ды ня вам схіляцца ніц,
І на наша сьвята
Буйным зернем празьвініць
Ураджай багаты!

Ільняная льлецца шыр,
У прыбоі мора жыта...
Хутка прозелень мяжы
Будзе ў пераджытым!.

... Хутка прозелень мяжы
Толькі ўсьне мо'праімжыць,
Праімжыць і зьнікне, як
Дзіўнае
і дзікае...
На палі, дзе дробны колас,
Дзе залом ня зломан,—
Разам з намі—
з комсамолам,
Руку,
агрономы!..
Мы зьмяняем твар зямлі
ўпартую будоўляй.
Мы даем загад ральлі
На ўраджай абноўлены!..
Мы бярэм цябе зямля,
Узьнімаем і пястуем,
Мы крычым табе:—Зямля,
Дай-жа ніву нам густую!..
Каб зьвінеў і зьзяў ячмень
У далонях поўных жмень!
Каб таемны лёну шум
Даў палотны для кашулі!
Каб хілілася пшаніца
Ад зярнят да долу ніцма!
Каб сьпявалі:
— Добра жыць!
Моцна пахне жытамі..
Хутка прозелень мяжы
Будзе ў пераджытымі..
1931 г.

Саксонскія комсамольцы ў Менску

У Менск для ўдзелу ў сьвяткаваньні 14-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі прыехала дэлегацыя саксонскіх комсамольцаў з 9 асоб. У ліку іх 2 маладыя рабочыя соцыял-дэмократы.

Дэлегацыя была горача сустрэнута менскай комсамоліяй і прымала ўдзел у дэмонстрацыі. Разам з прадстаўнікамі ЦК комсамолу, Менгаркому і „ЧЗ“ дэлегацыя наведала чырвонаармейскую частку, прыняла ўдзел у сьвяткаваньні на заводзе „Комунар“, „Бальшавік“ і БДУ.

АЎЛАДАЦЬ ВАГАРАМІ ВЫСОКАЙ ТАВАРНАСЬЦІ

„Ня толькі тэорэтычна даведзена, але і праверана на вопыце мільёнаў людзей магчымасьць пры дыктатуры пролетарыяту непасрэднага пераходу ад адсталае, малавытворчае, дробнае і дробнейшае аднаасобнае сялянскае гаспадаркі да буйнае колектыўнае высокавытворчае гаспадаркі“
(З пастановы XVI зьезду УсеКП(б))

За „тону-апарос“

Перад саўгасамі і колгаснымі таварнымі фэрмамі стаіць задача—дабіцца „тоны з апаросу“ ў 6-ці месячным узросьце.

Гэта значыць—перанесьці ў бліжэйшы час амэрыканскую тэхніку па вырошчваньню „тоны—апаросу“ у 6-ць месяцаў у практыку нашых саўгасаў і колгасных таварных фэрм. Тут комсамол павінен аб'явіць шырокую рашучую барацьбу „за аўладаньне тэхнікай сьвінагадоўлі“, за палепшаньне догляду, кармленьня і ўтрыманьня супаросных матак.

Пакрытыя маткі павінны быць у добрым целе. Узімку іх абавязкова трэба выпушчаць на сьвежае паветра (за выключэньнем дрэннага надвор'я і вялікіх, звыш 20° марозаў), а ўлетку—на добраякасную пашу па канюшыне.

У сутачны кармовы рацыён супаросных матак узімку павінны ўваходзіць: збожжавыя кармы 60-70 проц., сакавітыя—кармовыя бу-



ракі і морква 20-25 проц. і грубыя—сена канюшыннае 5-10 проц. У кармовых адзінках збожжавыя кармы ў сваю чаргу павінны складацца ня менш як з 3-4 відаў. На прыклад:

ячменнае мукі—20 проц. аўсянае— 40 пр. высевак (розных) 20 проц. альнянае макухі—15 проц. рыбнай ці мяса-касьцянае мукі 5 проц Усяго 100 проц.

Акрамя таго ў кармовую дачу супаросным маткам павінны ўваходзіць мінэральныя матэрыі: крэйды 1 проц. і паваранай солі 0,25 проц. ад колькасьці концэнтраваных кармоў у сутачнай дачы.

Супаросныя маткі павінны ўтрымлівацца невялікімі групамі, па 15-20 галоў у групе, у залежнасьці ад умоў утрыманьня. За 10-12 дзён да апаросу маткі пераводзяцца ў радзільныя сьвінарнікі. У гэтых памяшканьнях павінна быць сьветла (адносіны плошчы акон да плошчы сьвінарніка 1:10), суха, цёпла (тэмпература 8-10° Цэльсію і добрая вэнтыляцыя сыстэмы Кінга).

У час апаросу за маткай патрэбен спэцыяльны нагляд дзяжурнага для прыёмкі парасят. Кожнае народжанае парасё належыць старанна выцерці ад сьлізі чыстаю, сухою і мяккаю анучкай і пакласьці



ў загадзя падрыхтаваную скрынку з мяккаю, сухою подсьцілкай. Зьверху скрынка прыкрываецца мяшком.

Звычайна апарос працягваецца 2-4 гадзіны. Незалежна ад таго скончан апарос ці не, праз 2-4 гадзіны ад пачатку парасят трэба падпусьціць для кармленьня пад матку. Перад подпускам вымя маткі абавязкова падмыць цёплаю рошчынай 1 проц. крэоліну і насуха выцерці мяккім і чыстым ручніком. На другі дзень парасятам спэцыяльнымі ножніцамі абламваюць зубы.

Першыя два-тры дні тыдні, калі парасяты карыстаюцца выключна малаком матак, асноўныя клопаты прыдзецца накіраваць на тое, каб забясьпечыць маткам правільнае і добраякаснае харчаваньне. У сутачную дачу падсосным маткам, акрамя кармоў, што даюцца супаросным маткам, асабліва неабходна ўвесьці 2-3 літры здыманага малака.

Падкармліваць парасят пачынаюць з 2-х тыднёвага ўзросту падсмажаным ячменем і адначасова даюць маленькімі порцыямі, па 200-300 грам на апарос сьвежае, цёплае, падагрэтае да 30-35 градусаў каро'е малако ад заведама здаровых кароў.

Праз 2-3 дні, калі парасяты крыху прывучацца піць малако, ім дабаўляецца прасеяная ячменная і аўсяная мука. Па меры паяданьня корм з кожным днём павялічваецца.

У месячным узросьце парасят патрэбна прывучыць добра паядаць падкормку. З гэтага часу іх неабходна пераважыць на такую мешанку моцных кармоў:

1. ячменнай мукі 50 проц.
2. аўсянай 30 „
3. альняные макухі—10 проц.
4. мяса-касьцянае мукі 3 проц.
5. рыбнае мукі—5 проц.
6. сухіх драждждэй—2 проц.

Усяго 100 проц.

Гэтая концэнтраваная мешаніна ў сутачным рацыёне парасят павінна складаць—60 проц., а апошнія 40 проц. кармовых адзінак складаюцца з пэльнага сьвежага малака. Пачынаючы з 4-5 дзённага ўзросту парасятам неабходна ставіць мінэральную падкормку, якая патрэбна ім для разьвіцьця касьцяка. У склад мінэральнай падкормкі парасят узімку павінны ўваходзіць: перагнойная зямля (верхні пласт глебы) прыкладна 80 проц., попел з печы—5 проц., вугаль драўляны—5 проц., крэйда—5 проц. і цэгла тоўчаная —5 проц. У гэтай мінэральнай падкормцы парасяты будуць адшукваць і паядуць патрэбныя іх организму матэрыі.

Адымаць парасят ад матак пры вырошчваньні „тоны-апаросу“ трэба паступова, на працягу 3-4 сутак, і не раней 70-дзённага ўзросту. Робіцца гэтае дзеля таго, каб не папсаваць добра малочных матак, а таксама і таму, што парасяты, будучы пад маткай 70 дзён, даюць найбольшы прырост.

Для атрыманьня „тоны-апаросу“ выбіраюцца лепшыя па малочнасьці і скорасьпеласьці маткі, з добра разьвітымі, здаровымі парасятамі, ня менш 10 штук у апаросе. Пры ўмове правільна настаўленага кармленьня, догляду і ўтрыманьня, парасяты павінны гарантаваць наступны прырост жывое вагі: да 2-х месячнага ўзросту 300-400 грам кожны у суткі, з 2-х па 4 месяцаў 450-650 і з 4 да 6 месяцаў 900-1100 грам у суткі. **Буткевіч**

Буйная рагатая жывёлагадоўля БССР

Тры задачы комсамолу

Карова з усіх с-гаспадарчых жывёлін зьяўляецца найбольш выгаднай машынай для пераапрацоўкі расьлінных продуктаў у продукты спажываньня—малако. Каб поўнасьцю выкарыстаць гэту выгадную асаблівасьць каровы, неабходна палепшыць яе спадчынныя асаблівасьці і правільна організаваць кармленьне.

У колькасных адносінах буйная рагатая жывёлагадоўля БССР расьце даволі хутка. Так, колькасьць кароў у сялянскіх гаспадарках на тэрыторыі БССР была: У 1916 годзе 770051 адна галава, а 1926 годзе—1126273 галавы. Таксама паляпшаецца і якасьць жывёлы, г. зн. расьце продукцыйнасьць кароў. З лічбаў, якія т. Галадзед прыводзіў у дакладзе на 10 Усебеларускім зьезьдзе Саветаў, мы бачым, што продукцыйнасьць кароў у

1928 г.	у саўгасах—	14,7	цэнтн. малака,	у колгасах—	11,9 цэнтн.
1929 г.	„	16,9	„ „	„	12,8 „
1930 г.	„	20	„ „	„	14,3 „

Усё-ж, з гэтых лічбаў можна давесьці, што продукцыйнасьць кароў, хоць паступова і павялічваецца, але абсолютнае павялічэньне вельмі нізкае, асабліва калі параўнаць яго з продукцыйнасьцю заходня-эўропэй-



скіх культурных парод. З-за нізкай продукцыйнасьці кароў мы маем нізкую таварнасьць жывёлагадоўлі.

Асноўная задачай сопрэконструкцыі жывёлагадоўлі—гэта уздым продукцыйнасьці. Гэта работа у БССР распачата. Праводзіцца рад мерапрыемстваў, каб узмацніць кармовую базу, палепшыць заводзкі склад жывёлы праз мэтызацыю мясцовай жывёлы з культурнымі заходняэўропэйскімі пародамі. Важнейшая умова для мэтызацыі—не падпасаваць. Першы крок для палепшаньня мясцовай жывёлы—гэта раёнаваньне жывёлагадоўлі БССР (устанавіць у якіх раёнах якія культурныя пароды зьяўляюцца найбольш продукцыйнымі і прыдатнымі для палепшаньня. Часткова гэта работа ўжо праро[бл]ена. Для раёнаў (былых акруг) Віцебскай, Полацкай, Аршанскай, Магілёўскай і часткі Менскай) за паляпшаючую пароду прызнана швіцкая, а для буйных акруг (часткі Мазырскай, Гомельскай, Бабруйскай і другой часткі Менскай) за паляпшаючую прызнана чырвона нізкая парода чырвона-калёвіцкая, ангельская дацкая і чырвона-беларуская, трочым чырвона-беларуская парода зьяўляецца пры чым асабліва вага будзе пашыраючыся за якім зьмяніць гэтай пароды ў астатніх частках БССР. У частцы б. Мазырскай акругі ў паўднёва-заходняй частцы Гомельскай (па Дняпры) паляпшаючай пародай зьяўляецца нямецкая белагаловая жывёла.

Перамчаныя пароды і павінны за раз-жа зьмяніць сабою калейдоскоп даволі рознастайных парод. (У адным раёне б. Гомельскай губ, проф Каланта налічыў прадстаўнікоў 30 парод).

Якую карысьць для с-гаспадаркі БССР дадуць выбарныя высока-культурныя пароды можна бачыць с наступных лічбаў. Продукцыйнасьць мэтысных кароў, якія былі прадстаўлены на ўсебеларускую с-гаспадарчую выстаўку, хістаецца:

у мэтыс-швіцаў	ад 2250	да 4420	літр.
мэтыс-ангельск	„ 2280	„ 3940	„
мэтыс-нямецк.	„ 2236	„ 3311	„
мэтыс-дацк.	„	„ 5017	„

і г. д.

Калі скласьці гэтыя лічбы з лічбамі сярэдняй продукцыйнасьці беларускіх кароў, паданых у дакладзе т. Галадзеда, дык выгоднасьць мэтысацыі беларускай жывёлы стане відавочнай. Аднак, прыліваньне крыві культурных парод толькі тады дасьць належныя вынікі, калі над пародай, якая паляпшаецца, будзе весьціся інтэнсыўна племяная работа, інакш кажучы—сталы адбор лепшай жывёлы для заводзкай службы. У саўгасах і колгасах наладзіць гэты адбор лёгка.

Комсамольскія ячэйкі могуць аказаць вялікую дапамогу. Дапамога гэта павінна выразіцца у наладжваньні запісаў продукцыйнасьці і кармленьня жывёлы, у правільным вядзеньні злучных журналаў, у кантролі за выхаваньнем маладняка і г. д. Без дакладных запісаў нельга ўстанавіць велічыні продукцыйнасьці, кармленьня, заводзкай каштоўнасьці і адбору.

Комсамольцы могуць значна дапамагчы мясцовым зоотэхнікам у выяўленьні рэкордыстак (г. зн. кароў, якія даюць найвышэйшыя ўдоі па велічыні і па проценту тлустасьці малака), узвышаная продукцыйнасьць якіх тлумачыцца асабліва шчасьлівым злучэньнем спадчынных задаткаў. Аднак, толькі вельмі нямногія з кароў—рэкордыстак уладаюць здольнасьцю спадчынай перадачы сваёй высокай продукцыйнасьці, таму і значэньне іх у палепшаньні парод і асабліва значэньне іх сыноў, якія маюць тую самую здольнасьць, лёгка пераацаніць (вядомы выпадкі, калі за быкоў-паляпшальнікаў у Амэрыцы плацілі да 200 тысяч руб. на нашыя грошы).

Каб выявіць такіх паляпшальнікаў трэба спрабаваць іх спадчынную сілу. Дзеля гэтага трэба разабрацца ў паходжаньні нашага бычачага складу. Вось тут якраз асабліва важна ўстанавіць наяўнасьць кароў-рэкордыстак і іх сыноў, але зрабіць гэта сярод больш чым мільённага складу жывёлы БССР вельмі цяжка, і без дапамогі мясцовых работнікаў немагчыма. Адсуль відавочна ў чым могуць і павінны комсамольцы аказаць дапамогу зоотэхнікам. Трэба выявіць кароў-рэкордыстак хаця-б часткова выявіць якасьць іх патомства, перавесьці гэтых кароў у гурт племгаспадарак, каб дакладна вывучыць іх спадчынную сілу.

Ня менш сур'ёзная задача—сачыць як выконваецца зоо і вэтмінімум, растлумачыць важнасьць яго, аўладаць ім, дапамагчы зоотэхнікам у іх зоовэтпрофіляктычнай рабоце і г. д. Комсамольскія ячэйкі ў сваёй рабоце павінны цесна зьвязацца з мясцовымі зоовэттэхнікамі і гаразд[к]ою зональнаю станцыяй малочнай гаспадаркі, якая заўсёды адкажа на незразумелыя пытаньні і дасьць параду ў практычнай рабоце комсамольскіх ячэек.

Заг. сэктарам генэтыкі і разьвядзеньня Зональнай станцыі **Н. Пелехаў.**

Бугай чырвона-нямецкага заводу

Вучэцеся змагацца і перамагаць у „комінтэрнаўцаў“

КРУПКІ. Колгас „Комінтэрн“ па ўдарнаму змагаецца за рэалізацыю адозвы партыі аб разьвіцьці сацсьвінагадоўлі. Колгас давёў сьвіное пагалоўе да 100 штук.

Работы на сьвінарніках пераведзены на прэміяльна-прогрэсыўную зьдзельшчыну, шырока разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва сярод сьвінароў, з-за чаго палепшыўся догляд сьвіней і павялічыліся нормы выпрацоўкі. Калі раней 1 сьвінар даглядаў 15 сьвіней, дык зараз пры зьдзельна-прэміяльнай аплаце, спаборніцтве і ўдарніцтве даглядае 20.

Комсамольская ячэйка правяла вялікую работу па сьвінагадоўлі.

А. Я.

Узьняць ураджай і якасьць тэхнічных культур

1932 год павінен быць годам рашучае барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці тэхнічных культур і якасьці продукцыі. А трэба сказаць што да гэтага часу мы ўсім малую ўвагу ўдзялялі гэтаму пытаньню. Агрономічныя мерапрыемствы для павышэньня ўраджайнасьці ўжываліся выпадкова, бесплянава. Кіруючыя організацыі (Наркомзем, Белколгасцэнтр) толькі па некаторых з гэтых мерапрыемстваў давалі пэўныя плянавыя заданьні, а рэшту рэкамэндавалі „наогул“.

Асноўны ўпор рабіўся на „колькасныя паказчыкі, на колькаснае пашырэньне плошчы пад тэхнічныя культуры. На гэтым фронце мы маем за апошнія гады вялікія дасягненьні.

Пасеўная плошча лёну і канапель па БССР (у гэктарах).

	Лёну	Канапель
1916 г.	94500	15400
1925 г.	122900	21900
1927 г.	136200	28100
1929 г.	152300	30100
1931 г.	242000	34200

Аднак, на данным этапе адны колькасныя дасягненьні ў разьвіцьці тэхнічных культур нас задаволіць ужо ня могуць. Зараз перад намі ва ўвесь рост паўстала невідкладная і баявая задача—гэта барацьба за якасьць, барацьба за павышэньне ўраджайнасьці, за зьніжэньне страт ураджаю і за павышэньне якасьці продукцыі сыравіны тэхнічных культур.

Пачынаючы з 1932 г. асноўны ўпор робіцца на якасьць.

Каб дасягнуць перамогі на гэтым фронце, байцы-комсамольцы павінны быць узброены агротэхнічнымі ведамі. Комсамольскія організацыі ільнаводных і канапляводных раёнаў павінны поўнасьцю аўладаць тэхнікай ільнаканапляводзтва ў чым ім абавязаны дапамагчы навукова-дасьледчыя ўстановы, у першую чаргу Горацкая зональная станцыя лёну і канапель.

Конкрэтнымі задачамі комсамолу ільнаводных і канапляводных раёнаў на бліжэйшы адцінак часу зьяўляецца:

1. 100 проц. выкананьне пляну зяблівага ворыва і асеньняга пад'ёму цаліны пад лён і каноплі.
2. Асеньняе заворваньне гною пад каноплі.
3. Ачыстка пасеўнага насеньня лёну і канапель,
4. Захо[в]ваньне пасеўнага насеньня,
5. Падкоўваньне сабе тэорэтычна і па іншых агротэхнічных мерапрыемствах, як пратручваньне насеньня і яго аналіз, угнаеньне глебы пад тэхнічныя культуры, вясновая апрацоўка глебы, тэрміны і спосабы пасеву і г. д.

Аднача́сова з разгортваньнем барацьбы за высокі ўраджай тэхнічных культур 1932 году комсамольскія ячэйкі ільнаводных і канапляводных раёнаў абавязаны заразжа пачаць конкрэтны бой за пасьпяховую пераапрацоўку ільнасыравіны ў колгасах, за здачу дзяржаве ільнавалакна высокае якасьці.

М. Гуз…

КОМБІКОРМ—НА СЛУЖБУ СОЦЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ

1932 год—год ударнага разьвіцьця комбікармовай прамысловасьці ў саўгасах і колгасах БССР

Узяць пад комсамольскі кантроль выкананьне дырэктыў ураду аб комбікармовай прамысловасьці

...но з галоўнейшых, вузлавых ...ньняў пры вырашэньні проб... разьвіцьця соцыялістычнай ...лагадоўлі—гэта кармовае пы... ...не. Жывёлагадоўля ў БССР зай... будзе займаць у новым пя... ...овым народна-гаспадарчым пля... ...ну з вядучых галін сельскай ...даркі рэспублікі. Адзак кармо... ...лянс БССР мае дэфіцыт, аса... ...на моцных кармох, які тлу... ...цца шпаркім ростам нашай ...ялістычнай жывёлагадоўлі з ...о боку і, з другога,—шпаркім ...м пасеўных плошчаў пад тэх... ...чымі культурамі і травасеяньнем (бульба, лён, каноплі і г. д.).

...ніжэньне дэфіцытнасьці кармо... балянсу зьвязана з вырашэнь... наступных пытаньняў: павялі... ...е засеву бабовых траў на ...і лугох, павялічэньне сіло... ...ньня, пасеўных плошчаў пад ...вымі карэньплодамі, агра... ...чнае палепшаньне лугоў і вы... ...уздым ураджайнасьці, пра... ...ае скарыстаньне паўных кар... ...уцягненьне ў кармовы балянс ...к відаў сыравіны адкідаў хар... ...боенскай, маслабойнай і інш. ...рамысловасьці, (жывёльная, мінэ... ...ая, сыравіна і г. д.) Усё гэта ...ь ўцягнуць у корм праз выт... ...ьць комбікормаў, чым зьмен... ...а дэфіцытнасьць кармовага ...су на моцных кармох.

...оф. Дзьякоў вызначае камбі... так. „Камбікорм уяўляе са... ...я простую мэханічную кармо... ...мешанку, а мешанку," складзе... ...а сталаму рэцэпту, на пад... ...тае сумы ведаў жывёльнага ...зму і асаблівасьці кармоў, ...мы ўладаем і складзеную та... ...ынам, што жывёла зможа з ...мешанкі скарыстаць максі... ...раварных спажыўных матэ...

Э. А. Рохлас так характарызуе ...корм: „Ад добрага комбікорму ...абуецца, каб ён быў смачны, ...стайны, спажыўны, ня вельмі ...і, з добрым дзеяньнем на пе... ...ную сыстэму жывёлы і рабіў ...ўплыў на выхад. Комбікорм ...рабіць як з адкідаў і с.-г. ...расловасьці, маслабойнай—ма... ...іваварнай—у сухім відзе—... ...ліны, дрожджы, боенскай—кры... мука і масасьцяная; мы... ...рай—каштоўны і малакаштоў... ...адзь, бруўнальнай—у сухім і ...мяга, броварнай — сухая ...і г. д. так і з пераапрацоўва... ...кармовыя сродкі, якія непа... ...сваўляе жывёла (авёс, ...нь, сена лугавое, сена бабовых ...сушаная, лубін, мягіна, быль ...у комбікорм можна уводзіць ...рамалатым выглядзе галінкі ...лісьце, жалуды, каштаны і...

Развіцьцё комбікармовай прамы... ...ці ў БССР дасьць магчы... ...ць уцягнуць у кармовы балян ...жывапасы, якая дагэтуль не ...стоўвалася. Прапускаючы праз ...комбікорм нашы кармовыя рэсур... ...сы, мы тым самым зьмяншаем дэ... ...фіцытнасьць нашага кармовага ба... ...лянсу і павышаем эфэктыўнасьць ...кармовых сродкаў. Комбікорм ...дае вялікі рад дадатных ба... ...комбікорм дае магчымасьць ...спальна скарыстаць моцныя ...кармы, правільна забясьпечыць ...мінэральнымі солямі, павя... ...прадукцыйнасьць іх, насыць... замяніць моцны корм і г. д. ...арэньне жывёлы комбікормам ...таней, чым моцнымі ...рмамі.

Вопыт Нямеччыны ўпартыўна ...працаваць над пытаньнем ...ваньня розных кармоў ...яшчэ у 1910-13 годзе. ...вопыты пацьвярджаюць поў... ...сё вышэй сказанае аб ком... ...У час нямецкай вайны ў ...немагчымы быў завоз макухі ...рубеж. Каб замяніць іх, быў ...цаваны комбікорм з свае мае... ...сыравіны, люцэрны, сечы... ...ны, сої, і ...меласы, якія вызвалілі краіну ...завозу з сваёй

кармовай вартасьці ня ўступіў моцным кармом. Нямеччына ў час імпэрыялістычнай вайны праз комбікорм станоўча вырашыла дэфіцытнасьць свайго кармовага балянсу па моцных кармох. У сучасны момант за межамі комбікорму ўдзяляецца таксама шмат увагі.

Вопыты з комбікармамі вучоных СССР пацьвярджаюць высокую каштоўнасьць і вялікі экономічны эфэкт комбікармоў.

Проф Дзьякаў з вопытамі на каровах у Дзіцячым Сяле атрымаў наступны экономічны і тэхнічны эфэкт (за 3 гады).

Пры кармленьні кароў мяшанкай (комбікормам), якая складалася з саломы збожжавых і іншых), атрымана 5 проц. павялічэньня ўдою малака, 5 проц. тлушчы ў малаку. Кошт корму для атрыманьня адзінкі малака выразіўся ў 8,2 капейкі. Пры адваротнай замене (кармленьне ня мешанкай) удой зьменшыўся на 5 проц. зьменшылася і тлушча ў малаку на 6 проц., а кошт корму на адзінку прадукцыі выразіўся ў 9,5 кап. Калі дадзеныя проф. Дзякава распаўсюдзіць на гаспадарку, якая мае 3000 галоў дойных кароў, то атрымаем дадаткова 375 тон малака, альбо 35,1 тоны тлушчаў, альбо ў перакладзе на грошы 37500 руб. (лічачы адзін літр малака 10 кап.).

Гэтыя даныя яскрава і станоўча характарызуюць комбікорм, яго ролю на Захадзе, а таксама вялікую гаспадарчую небходнасьць шырока ўжываць комбікорм ў СССР наогул і ў прыватнасьці ў БССР ва ўмовах соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі. У СССР ужо пабудаваны цэлы рад буйных комбікармовых заводаў. У 1932 годзе намечана вялікая програма будаўніцтва новых заводаў. Беларускі ўрад заўжды надаваў і надае вялікае значэньне вытворчасьці комбікармоў.

Эконом-савет БССР (ад 28-V-1930 г.) вынес пастанову аб пабудове комбікармовых заводаў у БССР але шкоднікі—буржуазныя „спэцыялістыя", якія ў той час працавалі ў органах Дзяржпляну і НКЗ БССР (Каплан, Такмачоў, Сьвіршчэўскі), тармазілі праведзеньне гэтага важнейшага пытаньня ў жыцьцё, займаючыся непатрэбнай перапіскай.

23 ліпеня 1931 году Эконом-савет БССР вынес новую пастанову, якою даручыў Наркомзему БССР пабудаваць ў 1932 г. заводы мясцовага значэньня саўгасна-колгаснага тыпу у буйных саўгасах і колгасах. Наркомснабу даручана распрацаваць экономічнае абгрунтаваньне для пабудовы ў БССР буйнага заводу прамысловага тыпу. Навукова дасьледчым інстытутам даручана выпрацаваць рэцэптуру для комбікормаў і правесьці вопыты з комбікормамі з мэтай іх вывучэньня. Пастанова Эконом-савету БССР ня поўнасьцю выконваецца. Наркомснаб БССР з яго аб'яднаньнем Белкантораў „Саюзпрадкорм" да гэтага часу не напісаў экономічнага абгрунтаваньня для пабудовы заводу, чым ставіць будаўніцтва пад пагрозу зрыву. Ні Інстытут сьвінагадолі, ні Горацкая малочная зональная станцыя не вядуць патрэбных вопытаў з комбікармамі і ня могуць даць для БССР рэцэптуры комбікормаў, праверанай на жывёле.

Інстытут Соцыялістычнай Рэконструкцыі Сельскай Гаспадаркі ім. Леніна распрацаваў тып заводаў саўгасна - колгаснага значэньня з гадовай вытворчасьцю ў 3000 тон комбікорму. Гэты завод будзе абслугоўваць адзін буйны саўгас ці колгас (альбо групу меншых). Уніварсальная машына тыпу „Блізард" будзе малоць макуху, авёс, ячмень сена і наогул перапрацоўваць усю патрэбную сыравіну для вытворчасьці комбікорму. У 1932 годзе падобныя машыны мяркуецца выпрацаваць на гомельскім „Сельмашы" 4000 штук і на заводах Украіны 4000 штук для патрэб усяго СССР.

Гэту машыну абслужыць трактар „Інтэрнацыянал" у 30 конскіх сіл.

Т. т. Пяцько і Сарока—навуковыя супрацоўнікі НДІ, якія распрацоўваюць пытаньне разьвіцьця комбікармовай прамысловасьці ў БССР.

Запатрабаваньні нашых буйных соцыялістычных гаспадарак жывёлагадоўчага напрамку у моцных кармох не перавышаюць 3000 тон. Так напрыклад малочна-жывёлагадоўчая гаспадарка з агульнай плошчай каля 5000 га і пагалоў'ем буйнай рагатай жывёлы 3000 галоў, сьвіней 200, коняй— 250, патрабуе 2625 тон моцных кармоў (па нормах НКЗБ). 2625 тон моцных кармоў умоўна прыраўноўваюцца па спажыўнай вартасьці да аўса.

Абслугоўваць завод будзе машына „Блізард", Кошт машыны тыпу „Блізард" прыблізна 1000 руб.

Інстытутам Соц. Рэк. Сельскай. Гасп. імя Леніна падлічана, што сыравінная база для вытворчасьці комбікормаў дае поўную магчымасьць разьвіцьця комбікармовай прамысловасьці ў БССР.

Каб ліквідаваць усе адзначаныя прарывы у выкананьні пастановы Эконом-савету БССР (ад 23 ліпеня г. г.), каб шпарка вырашыць комбікармовую проблему ў БССР і правесьці у жыцьцё пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР „аб разьвіцьці соцыялістычнай жывёлагадоўлі", умацаваўшы гэтым кармовы балянс рэспублікі, як асновы вырашэньня жывёлагадоўчай проблемы—патрэбна усёй савецкай грамадзкасьці прыняць адпаведныя меры да зрыўшчыкаў працы па комбікармам і паставіць яе па належную вышыню.

Пецько і Сарока.

УЦЯГНУЦЬ МІЛЬЕННЫЯ МАСЫ

Ў барацьбу з сухмянём, у барацьбу за ўраджай

(З прамовы т. Молатава на ўсесаюзнай конфэрэнцыі па барацьбе з сухмянём)

Час ужо ўзяцца за барацьбу з сухмянём. Бальшавіцкая пастаноўка гэтага пытаньня ў нашай краіне ня можа не прыкаваць да сябе ўвагі шырокіх мас рабочай класы і колгасьнікаў.

Калі мы гаворым аб барацьбе з засухай у СССР,—мы гаворым аб велізарнай тэрыторыі ў некалькі дзесяткаў мільёнаў гэктараў на паўднёвым усходзе РСФСР і на поўдні Украіны. Гэтыя раёны пры сярэднім ураджаі даюць нам не адзін мільярд пудоў хлеба. Пры добрым ураджаі ў гэтых раёнах мы атрымліваем дадаткова некалькі соцень мільёнаў пудоў хлеба. За тое ў не... гады, у гады засухі, краіна недаатрымлівае таксама некалькіх соцень мільёнаў пудоў хлеба.

Для нас, бальшавікоў, гэта справа ня зводзіцца толькі для абаронных мерапрыемстваў супроць сухмяня. Бальшавіцкая барацьба з сухмянём цесна зьвязана з усёй барацьбою за ўздым вытворчасьці працы ў сельскай гаспадарцы. Для бальшавікоў барацьба з сухмянём—гэта арганізаваная па-савецку барацьба за ўздым ураджаю.

Факт скліканьня конфэрэнцыі па барацьбе з сухмянём падкрэсьлівае таксама, што зараз у сельскай гаспадарцы мы робім націск ня столькі на колькасныя, колькі на якасныя заданьні. Напэўна і сёлета і ў наступныя гады мы будзем дамагацца далейшага павялічэньня пасеўных плошчаў пад хлебам і іншымі культурамі. Але не ў пагоні за павялічэньнем проценту росту пасеўных плошчаў наша задача. З гэтага выцякае, што ў цэнтры нашай увагі павінны стаяць такія задачы, як барацьба за ўздым ураджаю, а разам з тым і барацьба з сухмянём і, значыцца, барацьба за усямерны ўздым вытворчасьці працы ў сельскай гаспадарцы.

У пытаньні вывучэньня ўмоў, пры якіх здараюцца сухмяні ў нашай краіне важна тое, што зможа дапамагчы больш шырокаму і разам з тым больш практычнаму падыходу к мерам барацьбы з засухай. У даных абставінах пры важнасьці вывучэньня навукова-фізычнага боку пытаньня у цэлым асабліва цікавіць тое, што адносіцца к прычынам і ўмовам, у якіх адбываліся сухмяні ў нашай краіне, скажам з пачатку 90-х гадоў мінулага веку. Неабходна пільная ўвага да такіх пытаньняў, як географія засух, пэрыодычнасьць і конкрэтныя асаблівасьці іх у паасобных раёнах і т. п. Дзеля гэтага было-б зусім да-рэчы бачыць на конфэрэнцыі па барацьбе з засухай адпаведныя карты з указаньнем раёнаў і географічнымі зьменамі сухмянёў за апошнія дзесяцігодзі, дыяграмы аб уплыве засухі на паасобныя раёны і галіны сельскай гаспадаркі і т. п. Але гэтага на жаль, тут няма. Нельга не адзначыць гэтага хаця-б, калі хочаце, у парадку самакрытыкі.

Нам неабходна усебаковае вывучэньне пытаньняў засухі і сур'ёзнае азнаямленьне са ўсімі навуковымі досьледамі ў гэтай галіне ня толькі у СССР, але у Амэрыцы і Эўропе. Асабліва неабходна нам вывучэньне тых конкрэтных пытаньняў, якія адносяцца да барацьбы з сухмянём, каб можна было практычна дапамагчы гэтай барацьбе ўжо у бліжэйшыя годы.

Бальшавікоў не запалохаеш грандыёнасьцю проэктаў, калі гэтыя проэкты навукова абгрунтаваны і практычна жыцьцёвыя. Ды ці трэба гэта даводзіць? На працягу усёй сусьветнай гісторыі ніхто яшчэ ня браўся за ажыцьцяўленьне такой грандыёзнай задачы, як ізрынуцьце капіталізму і пабудова соцыялістычнага грамадзтва, а бальшавікі за гэта узяліся і ажыцьцяўляюць сваю справу не бяз посьпеху.

Два словы аб рабоце нашых агрономаў. На гэту работу за апошні час зьвярталася мала ўвагі. Наркомзем Саюзу правільна зрабіў што узяўся за адважнае зьвішчэньне гэтага недахопу, за адважны паварот сельска-гаспадарчай работы да агротэхнікі.

Але з павінен асоба зьвярнуцца як да партыйных, так і да беспартыйных агрономаў, а н ват у асаблівасьці за беспартыйных, якія ў большай колькасьці.

Трэба лічыцца, таварышы агрономы з тым, што абставіны вашай работы на вёсцы у корні зьмяніліся. Вам прыходзіцца цяпер мець справу не з распыленымі малымі гаспадаркамі, а з задачамі організацыі буйнай соцыялістычнай гаспадаркі. Гэта патрабуе ад вас усё больш актыўнага ўдзелу ў гаспадарчым кіраўніцтве саўгасаў, колгасаў і машынна-трактарных станцый. Вы ўжо ня можаце заставацца толькі прапагандыстамі тых ці іншых палепшаньняў у сельскай гаспадарцы. Вы павінны стаць у большай ці ў меншай меры гаспадарнікамі. На практыцы гэта ўжо шмат дзе робіцца, але недастаткова. Гэты процэс павінен адбыцца організавана і з патрэбнай сьвядомасьцю, каб забясьпечыць тэмпы ў перабудове работы асноўнай масы агрономаў. З простых пропагандыстых сельска-гаспадарчай культуры агрономы ў рашаючай сваёй частцы павінны стаць актыўнымі ўдзельнікамі самай організацыі саўгаснага і колгаснага будаўніцтва, навучыцца ня толькі таму, як лепш укараніць паасобныя культурныя с-г. мерапрыемствы, але і таму, якімі шляхамі лепш падняць соцыялістычныя элемэнты ў сельскай гаспадарцы. Дзеля гэтага мы павінны перад усім навучыцца лічыць. Нельга дабіцца організацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня колгасаў, не навучыўшыся па-сапраўднаму лічыць працадні і г. д. Нельга палепшыць справу ў саўгасах, не навучыўшыся лічыць рублі і капейкі.

Задачы работнікаў навукі і практыкаў-будаўнікоў буйнай соцыялістычнай сельска-гаспадарчай вытворчасьці і ў прыватнасьці тых, якія аб'яднаны конфэрэнцыяй па барацьбе з сухмянём—сьмялей пракладваць шлях уперад да ўздыму вытворчых сіл сельскай гаспадаркі, сьмялей змагацца з сухмянём.

Задачы органаў савецкай улады ў гэтай справе—організаваць па-савецку сялянскія масы і, перад усім, колгасьнікаў і працаўнікоў саўгасаў на барацьбу за ўздым вытворчасьці працы ў сельскай гаспадарцы на барацьбу за ўраджай, за перасіленьне засухі.

РОТ ФРОНТ! братом па клясе-комсамольцам Саксоніі

СЬВЕДКІ і МАГІЛЬШЧЫКІ СЫСТЭМЫ ЦЭРГІБЕЛЕИ—У КРАІНЕ БУДУЮЧАГАСЯ САЦЫЯЛІЗМУ

Дэлегацыя рабочае моладзі Нямеччыны (Саксоніі) ў Менску

Ніколі яшчэ капіталізм ва ўсім сьвеце не знаходзіўся ў такім тупіку, як цяпер. Капіталізм і яго фашысцкі ўрадавы апарат напружваюць усе сілы, каб пры дапамозе фашысцкага тэрору, пры дапамозе здрадніцтва соцыял-фашызму, выбрацца з крызісу за кошт рабочых мас.

Комсамол Нямеччыны можа з упэўненасьцю сьцьвярджаць, што ўжо ў даны момант ён нанёс вялікія, невылячымыя раны соцыял-фашысцкай організацыі моладзі („С.Р.М.") **Саксонія**, цэнтр „левага" соцыял-фашызму, паказала прыклады добрага выкананьня гэтай адной з галоўных задач комсамолу Нямеччыны. Толькі за кастрычнік месяц **80 членаў „С. Р. М." перайшлі ў комсамол, з іх 48 толькі ў адным Лейпцыгу.** Тры аддзяленьні „С.Р.М." у Лейпцыгу (групы ў Рэйдніцы, Шлейсігу і старым-Лейпцыгу) пазбавіліся сваіх актывістых і амаль што спынілі сваё здрадніцкае існаваньне. „Левыя" соцыял-фашыстыя панабудавалі груп цэнтрыскае моладзі, але ўжо ў гэтым кірунку комсамольцы зрабілі прабоіну.

Саксонія—краіна, дзе беспрацоўе захапіла ў процантных адносінах больш рабочых, чым у іншых краінах Нямеччыны. **Саксонія краіна жабрацтва і голаду, краіна тэкстыльных магнатаў і тэкстыльных нявольнікаў, якія атрымліваюць найменшую зарплату, чым якая-небудзь іншая група рабочае клясы Нямеччыны, краіна сярэдніх прадпрыемстваў, дзе эксплёатацыя рабочых і асабліва рабочае моладзі, дасягае вялізарных памераў.** І Саксонія—цэнтр „левага" соцыял-фашызму, які стварыў цяпер цэнтрысцкую партыю, каб пабудаваць вал супроць радыкалізаваньня рабочых мас.

Комсамол Саксоніі налічвае 7000 членаў. Але ў дэлегацыі ўдзельнічаюць ня толькі комсамольцы, бо мэты дэлегацыі даць магчымасьць галоўным чынам прадстаўніком організацыі соцыял-дэмократычнай моладзі азнаёміцца з ажыцьцяўленьнем ідэй соцыялізму ў СССР і пераканацца ў правільнасьці ідэй комунізму. Дэлегацыя разам з вамі абгаворыць вынікі соцспаборніцтва паміж комсамолам Менску і Лейпцыгу і мае на мэце:

заключыць дагавор па соцспаборніцтва паміж комсамолам Саксоніі і комсамолам Савецкай Беларусі ў лепшым зьдзейсьненьні пастаноў КІМ'у.

Дэлегацыя абрана масамі працоўнае моладзі на агульных сходах у ячэйках комсамолу і на мітынгах.

1. Бамбэргер Вільгельм кіраўнік дэлегацыі з 21 году, каваль, беспрацоўны, оргсэкратар Фатляндзкай акругі і ўдарнік комсамолу Плаўніі. У комсамол прышоў з піонэрскай організацыі. Комсамол Фатляндыі мае 700 сяброў. Фатлянд акруга тэкстыльных і мэталургічных фабрык. У Фатляндыі распаўсюджана яшчэ старая сыстэма працы на дом—вынікі якога галеча і голад. У Фотляндыі цэнтр новай цэнтрысцкай партыі соцыял-фашызму і ня гледзячы на гэтае ў надзвычайна кароткі тэрмін 5 сябраў гэтай організацыі перайшло ў комсамол.

Метцнер Карл 21 году, токар па мэталю, беспрацоўны. Сябра комсамолу гораду Цытраў у Верхняй Сілезіі і палітсэкратар верхнясілезкай акругі. Год таму назад уступіў у КСМ.

Комсамол Верхняга Лаўзіца мае 200 сяброў. У Верхнем Лаўзене найбольш тэкстыльнай прамысловасьці, у якой работніцы зарабляюць па 4-5 марак у тыдзень. Галеча самае характэрнае для Верхняга Лаўзеца.

Вальтер Ланге. Ударнік комсамолу Лейпцыга. 18 год, тыпаграўшчык, беспрацоўны. У чэрвені 31 г. вышаў з „СРМ" і уступіў у комсамол. Зараз выконвае працу агітпрапагандыста ў 6-ым раёне Лейпцыга. Гэты раён мае 80 комсамольцаў. Усяго ў Лейпцыгу 1200 комсамольцаў. Уплыў „СРМ" паслабляецца ня гледзячы на тое, што ён яшчэ мае (афіцыйна!!!) 1500 сяброў. Лейпціг галоўны прамысловы цэнтр Саксоніі і таму задачы комсамолу Лейпцыга хутэйшымі тэмпамі ліквідаваць яшчэ існуючы ўплыў „СРМ".

Рудольф Люман—беспрацоўны маляр, 21 год. Ударнік комсамолу Бурцэну (каля Лейпцыгу). Вурцэн мае каля 3000 чалавек насельніцтва, якія жывуць ад прамысловасьці. Навокал Вурцэну шмат вёсак дзе яшчэ ёсьць уплыў фашызму. Вурцэнская організацыя налічвае 35 членаў і лічыцца лепшай брыгадай Лейпцыгскага комсамолу.

Пейпельман Анна—работніца, 22 гады. Кіраўнік піонэрскай організацыі Вурцэна, якая налічвае 30 асоб. У комсамол паступіла з піонэр організацыі.

Шпарт Герберд—беспрацоўны мэталісты, 19 год, дэлегат Лейпцыгскага комсамолу. Абраны на зьлёце 700 лейпцыгскіх комсамольцаў. Ён зьяўляецца дэлегатам лепшага гарадзкога раёну Лейпцыга-Мокаў, які на працягу 5 тыдняў узрос з 6 да 46 сябраў.

Фрыц Ваймер—18 год, тыпаграўшчык. Абраны ў дэлегацыю на сходзе С. Р. М.. Яго паслалі з мэтай азнаёміцца з ажыцьцем працоўнай моладзі СССР каб пасьля вырашыць ці варта заставацца ў здрадніцкай „С. Р. М." або переходзіць у комсамол. У Дрэздэне комсамол налічвае 800 членаў „С. Р. М. толькі 400.

Ротэ Іоганэс—19 год муляр з Кемніцу член „С. Р. М." Абраны ў дэлегацыю на мітынгу комсамолу на якім выступаў былы намесьнік старшыні Ніжне-Рейнскай організацыі „С. Р. М." На гэтым сходзе 6 членаў „С. Р. М." уступіла ў комсамол і была ўхвалена накіраваць т. Ротэ ў Менск.

Макс Рэннер—19 год, муляр з Кемніцу, актывіст комсамолу.

Мы ўпэўнены, што комсамольцы Саксоніі шмат чаму навучацца і [illegible] іх з тым саб [illegible] дапамагалі нам разьбіць хлусьні супроць сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР.

Комсамольцы Савецкай Беларусі і Саксоніі!

Наперад, у новыя баі, да новых перамог, пад сьцягамі КІМу.

А. Проко.

Лейпцыг 31-га кастрычніка 1931 г.

„Ір зінд гросс"

Калі ўдарнікі Савецкага саюзу прыехалі ў капіталістычную Нямеччыну, у Гамбург, іх зьдзівіў магутны гамбурскі порт, тэхніка Вільскага каналу, які злучае Нямецкае мора з Бальтыкам. Гэтая магутная пабудова сапраўды зьдзіўляе.

Яшчэ больш зьдзівіла іх тое, што гэтая магутная пабудова стаіць у бязьдзейнасьці. Трубы 600 параходаў пакрыты брызэнтам.

Што можа зьдзівіць маладога комсамольца Саксоніі т. Макса, калі ён сёньня прыехаў у СССР, праз 14 год пасьля 1-га ў сьвеце Кастрычніка? На запытаньне аб рабоце ён няўмелна махае рукамі, робіць гесты, як бядзецца на ўвесь вашу кельмай: „ён—рабочы будаўнік, тынкар, і дадае:—беспрацоўны.

Эмма—маладая работніца Саксоніі комсамолка—беспрацоўная, з маладых рабочых, якія ўжо зараз толькі ўспамінаюць аб працы. Зацікавілі яе аб прафэсіі, аб заробку ўваскрашаюць успаміны аб малатку, аб працы. Тады ён локцем правай рукі стукае ў далонь левай, а пасьля—мо... на сьціснутым кулаком па далоні, як рытмічна стукаюць малаткі.

Што можа зьдзівіць маладога 20-гадовага Макса, які 6 год у комсамоле, 3 гады у комуністычнай партыі Нямеччыны, за плячыма турэмная камэра, рукапашныя схваткі з клясавым ворагам.

Яго дзівіць усё. Усё зьяўляецца контрастам.

Ён ужо шмат ведае аб Савецкім саюзе. Але што значыць убачыць гэтае сваімі вачыма, пагутарыць з комсамолкай чырвона-штандарнай гарбарні „Бальшавік", якая выканала плян 5-ці годкі ў 2 гады.

На ... да гарбарні Эмма ўсё пыталася за які час выканалі 5-цігадовы плян. Гэта ёй асабліва цікава.

Вось гэта металапрацоўчы завод імя Варашылава

— А як ён выконвае 5 цігадовы плян?—зноў-жа пытаецца яна. 5-цігодка стала нечым блізкім, усім знаёмым.

Т. Макс ужо ня толькі па-нямецку кажа аб 5-цігодцы ў 4 гады, але гэта першыя беларуская слоўка, якіх ён даведаўся.

* * *

Слова ад дэлегацыі комсамольцам Саксоніі мае старшыня дэлегацыі т. Вільгельм.

Горача, па-комсамольску, па-маладому сустрэла комсамолія „Бальшавіка" нямецкіх таварышоў.

Прамова т. Вільгельма гублялася для аўдыторыі адразу-ж пасьля слова „генасэ". Па сьвятошнаму

Т. Вільгельм Бамбэргер — старшыня саксонскай комсамольскай дэлегацыі.

дзелавой была прамова кіраўніка дэлегацыі т. Вільгельма у адказ на рапарт комсамолу „Бальшавіка" аб выкананьні соц. умовы з лейпцыгскім комсамолам.

Комсамол Лейпцыгу абавязваецца да 1-га мая ўцягнуць у рады комсамолу 1000 комсамольцаў. Прычым у гэты лік павінны уцягнуць 200 з іншых варожых юнацкіх організацыяў. Гэта ва ўмовах працы ўсіх сваіх КІМ'у, а таксама комсамолу Саксоніі мае агромадное значэньне. Соцсамол павінен быць ліквідаваны як масавая організацыя юнацтва, праз якую соцыял-фашысты выхоўваюць рабочую моладзь. Таму гэты абавязак мае агромаднае значэньне ў напрамку выкананьня гэтага лёзунгу.

Лік фабрычных ячэек павялічыць да 100. За апошнія 3 месяцы комсамол Саксоніі організаваў 80 фабрычных комсамольскіх ячэек. Ва ўмовах працы замежнай комсамоліі, дзе варожыя юнацкія організацыі маюць уплыў на рабочую моладзь, дзе усе прадпрыемствы фашызуюцца, гэта агромадная перамога комсамолу, ня гледзячы на тое, што комсамольскім ячэйкам на фабрыцы прыходзіцца працаваць фактычна ў падпольлі, заваёўваючы рабочую моладзь.

Комсамол Саксоніі,—кажа т. Вільгельм,—кіруе піонэрскай організацыяй. Піонэры стала зараз організаваюць рух забастовачнага руху вучняў, якія протэстуюць супроць паходу Ураду Саксоніі на сацыяльнае навучаньне, супроць скарачэньня настаўнікаў, асабліва маладых.

У новай сталоўцы заводу „Комунар" дэлегацыю сустракалі комсамольцы машына-будаўнічага заводу.

Ад імя дэлегацыі, ад імя сьведкаў тае жорсткае барацьбы ў буржуазнай бюргерскай Нямеччыне, што адбываецца ў кожным рабочым квартале, гаворыць т. Карл.

Т. Карл апавядае аб становішчы рабочых мас, аб тых цяжкасьцях крызізу, якія буржуазія імкнецца перакласьці на плечы рабочых мас.

— Уступленьнем у комсамол я хачу справіць сваю віну за маё прабываньне ў варожай нашай справе організацыі. Мяне абманвалі, але зараз я ўжо ведаю праўду.

— На ўрачыстым сходзе малады рабочы, соцыял-дэмократ Саксоніі—т. Георг, заяўляе аб уступленьні ў комсамол.

Т. Георг расказвае аб нечуванай хлусьні, якую ўзводзяць на СССР соцыял-фашыстыя з мэтай выхаваць моладзь у патрэбным для іх кірунку.

* * *

Рот Фронт! Рот Фронт! Рот Фронт!

Т. Георг Дуллек—малады рабочы дагэтуль соцыял-дэмократ У час Кастрычнікаўскіх сьвят заявіў аб пераходзе ў комсамол.

Дэлегацыя сярод пролетарскага студэнцтва.

Т. Вільгельм коратка, сьціслa перадае свае ўражаньні, уражаньні сваіх таварышоў аб тым, што яны бачылі ў Савецкім саюзе толькі за 2 дні, дае сьціслае параўнаньне культурнага заняпаду капіталістычнай Нямеччыны і тае культуры, якая нарадзілася і расьце ў Савецкім саюзе.

* * *

Дэлегацыя навелала кавалерыйскую частку, дзе яна азнаёмілася з жыцьцём і працай чырвонаармейцаў.

Як многа дзіўнага ўбачылі яны тут.

— У нас ня так. У нас—наадварот.

Мы ішлі міма пабудовы Дому Ураду. З вышыні 11 паверхнага пад'ёмніка глядзела асьветлёная постаць Ільліча.

— Ір зінд грос—(Вы вялікія!)

Ш—ра.

Нам. адказн. рэдактара С. АНІСА...

Паведамленьне

Менгарком ЛКСМБ прапануе ўсім комсамольцам прыгараднай паласы, якія працуюць у шматтыражках і насьценгазэтах саўгасаў, колгасаў, камун і МТС членамі рэдколегіі, зьявіцца 11—XI роўна а 10 гадзіне раніцы, у памяшканьне Менгаркому КП(б)Б на нараду членаў шматтыражак і насьценгазэт прыгараднай паласы, скліканую Менгаркомам КП(б)Б.

Заг. Культпропу Менгаркому КСМ Фрумкіна.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.

АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна. Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.